Перепечатано из журнала „Прожектор“.

В лапах румынских палачей.

(Румынский коммунист тов. Паукер голодал 39 дней).

3 мая в румынской каторжной тюрьме Жилаве об'явил голодовку известный деятель коммунистического движения тов. Паукер. От него получено

Ячейка Мопр'а за работой.

письмо, написанное им 20 мая (на 17 день голодовки)...

Я начал голодовку 3 мая, сейчас же после ареста. 5 мая я уже был в Жилаве. 8 мая началось искусственное кормление, несмотря на сопротивление, письменные протесты и формальное запрещение соответствующих законов. Меня избивали, рвали на мне платье, исцарапали все тело. Каждый день по 2, 3, 4 раза меня бросают на матрац, солдаты держат меня за голову, шею, руки и ноги и вливают через трубку, вставленную в окровавленный нос, пищу. Эти страдания продолжаются уже две недели, но ни одна газета ни единым словом не упомянула об этом.

Но эти насилия ни к чему не приведут. После такого „питания" у меня наступает сильная рвота. Кроме того, с 8 числа я отказался и от воды, ничего не пью, несмотря на то, что мне вливают соленую воду, чтобы вызвать жажду и заставить пить.

Искусственное питание им не удается. Теперь после 17 дней голодовки и на 13 день после того, как я отказался пить, меня перевели на общее положение, но к обычному режиму присоединяются страдания от насильственного кормления.

Голодовку буду продолжать. Расчитываю на активную солидарность международного пролетариата.

Примечание. Тов. Паукер выпущен из тюрьмы, он голодал 39 дней.

Супроць вайны.

Шосты кангрэс Камінтэрну паставіў важнейшай задачай Камуністычнай партыі барацьбу супроць падрыхтоўкі капіталістымі і здраднікамі сацыял-дэмакратамі імпэрыялістычнай вайны і нападу на Савецкі Саюз.

Першае жніўня гэтага году абвешчана 6-м кангрэсам Міжнародным Чырвоным Днём.

1-е жніўня павінна быць днём смотру сіл рэволюцыйнога пралетарыяту.

1-е жніўня павінна сплаціць усіх прыхільнікаў Савецкага Саюзу навакол лёзунгу Абароны СССР.

У гэты дзень ў капіталістычных краінах мільёны рэволюцыйных пралетарыяў, пад кіраўніцтвам камуністычных партый заявяць усяму міру аб сваёй салідарнасьці з працоўнымі СССР.



Капиталисты готовятся к войне.

Гэты дзень у капіталістычных краінах будзе адзначан забастоўкамі, дэманстрацыямі.

У Савецкім Саюзе Чырвоны дзень будзе праводзіцца пад лёзунгам „братэрскай салідарнасьці" з пралетарыятам капіталістычных краін Замежныя працоўныя ў гэты дзень павінны яшчэ больш адчуваць братэрскую руку рабочых і работніц Савецкага Саюзу.

Чырвоная армія ў лягерах.

Работніца і сялянка, узмацняй Чырвоную армію — вартаўніка соцыялістычнага будаўніцтва!



ЧЫРВОНААРМЕЙЦЫ.

Ціха рэе—
Палынее
Сьцяг чырвоны.
Пад ім роем
Чынным строем
Рэюць тоны
Песень волі...
Роўным полем,
Грамадою
Ідзе паходам
Ўзвод за ўзводам,
З прагай к бою,
Полк чырвоных.
Шчэць стальная
Адбівае
Промень сонца.
Душ бясконца!
Стома давіць!
Ўсё-ж ня ўбавіць
Моцнай прагі
І адвагі,
Што ў іх сэрцах.
Ступ за ступам
Ідуць купай
Ў бой да сьмерці
За свабоду
Для народу
Легчы з славай.
Ці-ж утратна
Дружна, здатна,
Вялічава
Гук нясецца!
Пламя-ж льлецца
Пазалотай
З небнай выcі.
І песень тоны
І сьцяг чырвоны
Ў ім зьліліся!

Ц. Гартны.

Малюнкі: (зьверху)
1—Парад.
2—Рабочыя разглядаюць кулямёт.
3—У палатцы.
4—Наладзілі гульні.

УВАГА ДЗЕЦЯМ!

Піянэр-арганізацыя дапаможнік у выхаванні нашых дзяцей. Забясьпечым наведваньне школы бядняцкімі дзецьмі. Паклапацімся аб малышах—арганізуем для іх яслі. Падбярэм у яслі надзейных працаўнікоў.

Пионеры—в лагеря.

Уже 2 года, как бывшее имение Горвата (Наровль) цветет красными галстуками юных пионеров. Там расположены лагеря пионеров. Огромный дом над рекою сзеркальными стенами теперь в распоряжении наших детей. Много солнца, воздуха, огромный парк. Рвутся ребята в лагеря—отдохнуть. Хочется также посмотреть хоромы бывшего графа Горвата. Привлекает хороший воздух, огромные зеркальные комнаты, где теперь отдыхают наши пионеры.

Пионерский лагерь разбивается на три очереди. Для посылки в лагерь и сбора денег работает комиссия, членом которой состою и я. Комиссия учитывает социальное положение каждого пионера. Монету частично дают родители, в остальном помогают завком и союз. Очень пригодились и средства от сбора лома-железа. Просим матерей через „Беларускую раб. і сялянку" рассказать, как отдыхают пионеры у вас.

Виленская Н.

Мозырь, ф-ка „Красный Октябрь"

Дзеці будуць дагледжаны.

Дэлегаткі паднялі пытаньне аб арганізацыі дзіцячай пляцоўкі. Абралі камісію з дэлегатак мястэчка і саўгасу. Камісія ўзяла на вучот усіх дзяцей, склала каштарыс, склікала бацькоў і разьмеркавалі на кожнага плату.

Камісія прыцягнула мясцовыя арганізацыі яч. КСУ, Спажкаапэрацыю С/С, каапэрацыю шавецкую, арцель ад якіх сабрала 150 руб. Пляцоўкай будзе ахоплена 50 дзяцей—40% дзеці беднаты ад платы па ўтрыманьні вызваляюцца.

Каб больш адшукаць сродкаў, дэлегаткі парашылі арганізаваць платны спэктакль, а таксама ўзяліся гатаваць дзецям па чарзе сьнеданьне. Зараз мы ўпэўнены, што дзеці саўгасьніц, мястэчак будуць выхоўвацца правільна.

Школьнікава.

м-ка Леніна. Аршанскай акр.

Бедняцких ребят в школу.

Дети бедноты будут учиться—решили делегатки Славного. Пошли с подписным листом, собрали 19 р. 28 к. Организовали два спектакля—выручили 44 руб. На собранные 63 р. 28 к. одели, обули и обеспечили до конца года письменными принадлежностями 42-х бедняцких детей.

Так мы помогаем учиться бедняцким ребятам. **М. Метрик.**



Вада, сонца і паветра ўзмацняюць здароў'е.

УМОВА

Мы, сяляне вёскі Гатава, заключаем гэту ўмову з выканбюро Шэфтаварыства ячэйкі ФЗУ ў тым, што мы для арганізацыі дзіцячых яслаў бярэм абавязак даць наступнае:

1—сяньнічкі, пялёнкі і падушкі для ложкаў, 2—хлеб, 3—малако, 4—яйкі, 5—масла, 6—бульбу, 7—крупы—ячныя дробныя, 8—дровы.

Астатняе, неабходнае для яслаў, чаго ў сялян няма,—дае абавязак набыць Шэфтаварыства.

Подпісы:

Старшыня Шэфтаварыства

Старшыня Сельсавету

За такія жарты даўно пакараць варта*).

Сеньня вы сядзіце на прызьбе; падойдзе сусед, дасьць вам пстрычку на носу, так што вы абальлецеся чырвонаю юхаю, зарагоча і скажа: „Гэта я пажартаваў“. А калі пстрычка пярэйдзе ў замах на больш небясьпечнае!

Вядома, вы скажаце—на гэта ёсьць суд. Калі-ж вы чалавек больш спакойны, то знойдзеце выхад такі: пазбавіцца ад жартлівага суседзтва.

Трубінаў Янка „забаўляецца“

Па вуліцы ціха, спакойна праходзіць дзяўчына. Да яе раптам падскочыў хтось. Не пасьпелі вы апамятацца, як спадніца дзяўчыны апынілася на галаве.

Дзяўчына палахліва лупнула вачыма. Наўкола людзі. Яна шукае ў іх абароны, ці хаця-б спачуваньня. У адказ чуе здаволены раскацісты рогат. І гэта не байка, а праўда сёнешняга дню. Так „забаўляецца“ Трубінаў Янка з саўгасу Леніна, Аршанскай акругі. У жартах такіх і мацнейшых ён напрактыкаваўся на ўласнай жонцы—адлупцаваў яе сёньня як і штодзенна, а зараз яшчэ рукі сьвярбяць. Таму зьдзекі ён перакінуў на новыя „цацкі“—саўгаскіх дзяўчат. А хэўра яго стаіць і рагоча.

Дзяўчаты ўступіліся за пакрыўджаную.

— Кіла ты, шанкір, шлюха,— абзывае Трубінаў абаронцаў. Плюне і пойдзе далей.

У садзе дзяўчаты на гуталцы (і тут не схавацца ад жартаў). Схопіць вяроўчыну хлапец з тэй-жа хэўры, крутанецца і цаляе абняць дзяўчыну, ня рукамі, а... нагамі. Зноў „жартлівыя“ людзі рагочуць.

Жарты ці злачынства.

Абураючыя ўчынкі трубінаўцаў маюць сваю пасьлядоўнасьць; даведаўшыся аб тым, што рабочыя саўгасу пастанавілі выйсьці на поле працаваць у вялікдзень, Трубінаў навастрыўся. Камсамолку — Ландрын Кацю, якая першая вышла на працу ў вялікдзень, Трубінаў адлупцаваў бізуном, вылаяў, схапіў за грудзі і выкінуў з хаты.

Можа і гэта забава, з якое можна парагатаць?

Не. Тут не да сьмеху. Тут злачынства, падрыў пачынаньня працоўных саўгасьніц замяніць папоўскі вялікдзень сьвятам працы.

За Кацю ўступіліся тыя, каму дорага праца, гаспадарка, новае жыцьцё—рабочыя саўгасу Дралінскі, Дарэўскі і іншыя.

Уступіліся. Але дзе была дагэтуль грамадзкасьць, на што глядзеў рабочком? Выпадак на вялікдзень ёсьць толькі адзін момант з чародкі недапушчальных учынкаў. Зьдзекі над дзяўчатамі праходзілі на вачах рабочкома. Рогат трубінаўскай хэўры трэба было ў зародку заглушыць рашучым словам саўгаскай грамадзкасьці. Хто моўчкі пазіраў на гэта, той пасабляў перарасьці лаянцы ў лупцаваньне камсамолкі.

А як выяўлялі сябе камсамольцы? Камсамолец Камароўскі навыперадкі з трубінаўскім гуртам у іх бруднай справе. Ён абраў адхожым месцам... дзяўчыну—абмачыўшы яе. І тут рагаталі. І гэта жартам лічылі.

Грамадзкасьць, адгукніся!

Зараз дэлегацкі сход выказаўся: „Усё гэта перашкаджае работніцам саўгасу ўдзельнічаць у культурна-масавай працы“. Дэлегацкі сход патрабуе зрабіць паказальны суд над хуліганамі.

Правільнае патрабаваньне. Трэба вырваць з карэньнем брыдоту, якая блытаецца ў нагах, перашкаджае будаваць, ісьці па шляху перабудовы быту. Трэба вызваліцца ад „жартлівых“ трубінавых.

В. Х.

м. Леніна, Аршанская акр.

Работнице отпускнице.

Перед каждой работницей, проводящей свой отпуск в деревне, в этом году стоит особо ответственная задача—использовать свое пребывание в деревне, чтобы помочь перестраивать сельское хозяйство на социалистический лад.

Каждая работница, уезжающая в деревню на отдых, должна спросить себя, что она знает и практически может рассказать трудящимся крестьянкам о политике партии в деревне: о коллективизации, о сельхозналоге, об отношении соввласти к батраку, бедняку, середняку и кулаку.

Работнице в деревне придется столкнуться с классовой борьбой в деревне, с вопросом организации колхозов и других видов сельхозкооперации, вопросом повышения урожайности, с работой делегатских собраний, детских учреждений и пр.

На работнице в деревне лежит большая обязанность — помочь организовать социалистическое соревнование в сельском хозяйстве.

На сходах крестьянок, на делегатском собрании надо раз'яснить значение социалистического соревнования в сельском хозяйстве.

Помочь крестьянкам организовать колхоз, какое нибудь товарищество, лучше подготовиться к осенней посевной кампании, организовать помощь беднячкам-вдовам в уборке урожая. Не молчать, когда столкнется с фактами искажения классовой линии той или иной местной организации в отношении к батраку, бедняку, середняку. *Научить батрака и бедняка отстоять свои интересы против кулака.*

Работница, твой долг рассказать трудящейся крестьянке, почему и как необходимо бороться с кулаком и подкулачником. Если столкнешься с фактами злоупотребления, пиши об этом в газету, сообщи в парторганизацию.

Не забудь перед от'ездом взять с собой новейшую литературу по вопросам работы в деревне: о коллективизации, о сельхозналоге, о повышении урожайности.

По приезде из деревни зайди в парт'ячейку, завком, шефбюро и расскажи о всех недочетах в работе в деревне, чем шефбюро должно помочь.

Такая помощь работницы в деревне—это самый лучший метод осуществлять на деле смычку пролетариата с основной массой крестьянства.

*) Факты ўзяты з пісьма сялькоркі.

КАК ЖИВЕМ, ЧТО ДЕЛАЕМ

КУЕМСЯ ДЛЯ ПРАЦЫ.

Арганізаваў 4-х дзенныя курсы нарады жанчын членаў сел.-сав. З разьлікам на две жанчыны ад кожнага с.-с.

Гэтакім чынам у раёне будзе яшчэ больш моцны жаночы актыў. **В. Жураўлёва.**

Гарадоцкі раён.

ЗА КНІЖКУ, ГАЗЭТУ, ЗА РОЗУМ, АСЬВЕТУ.

55 жанчын скончылі лікпункт па Ленінскаму раёну. Усяго працавала ў раёне 6 лікпунктаў. Усе гэтыя жанчыны выпісваюць Белрабсялянку. **Ш.**

М-ка Лінена.

ДЭЛЕГАТКІ ЗАВОДЗЯЦЬ ПАРАДКІ.

Пры двух дэлегацкіх сходах закладваюцца паказальныя вучасткі. Апрацоўваюць гэтыя вучасткі самі дэлегаткі супольна з актывам вёскі. Попелу сабралі дэлегаткі 20 пудоў. **Завесіна.**

Старыя Дарогі.

ПАПОЎНАМ ДЗЯЦЕЙ НЕ ДАВЕРЫМ.

Ужо адчыняюцца дзіцячыя пляцоўкі і ясьлі. Трэба зьвярнуць асобую ўвагу, каб былі добрыя працаўніцы, каб ня папалі на гэту працу папоўскія дачкі, бо

Прысылайце нам у ясьлі добрых цёцяў.

яны ня хочуць працаваць, як трэба.

Напрыклад, у нас у вёсцы была ў мінулым годзе адчынена пляцоўка. Загадчыцай была папоўская дачка нейкая Жыгуповіч. Яна працу вяла з перапынкамі: дзень працуе, а тыдзень дома сядзіць. **Ярмакова.**

в. Зачысьці.

ЧЫРВОНЫ ПЕВЕНЬ ГУЛЯЕ.

10-га чэрвеня ў вёсцы Раўнапольле, Сьмілавіцкага раёну, здарыўся вялікі пажар, ад якога пагібла 47 гаспадарак. Прычына пажару знойдзена: дарослыя торп капалі, 6-гадовыя дзеці наклалі ў сенавале з саломы агню. Каб ня гуляў на вёсцы чырвоны певень, трэба арганізаваць дзіцячыя ясьлі, якія-б сачылі за дзецьмі. А таксама трэба дзецям курыць забараняць.

Язэп Ракіта.

Вёска Раўнапольле, Меншчына.

НЕДАХОПЫ ПАД АБСТРЭЛ.

НЕ ПРАМАРГАЙЦЕ ЯСЬЛІ.

Маецца загад у нашым рабочкоме: даць зьвесткі аб ліку дзяцей у вучгасе і выказаць сваю думку, што больш патрэбна вучгасу—ясьлі ці пляцоўка. Але рабочком з гэтым не сьпяшаецца, а пакуль уздумае, дык прыдзецца застацца і бяз ясьляў і без пляцоўкі. **Кавалеўская.**

Беліца, Сененскі р-н.

НЕ ТРАПЯЦЬ ЧАСУ ПАГУТАРЫЦЬ З СЯЛЯНАМІ АБ КАЛГАСЕ.

Падштурхнеце вы нашу ячэйку, каб пагутарыла з сялянамі пра калгас, дапамагчы арганізавацца.

Бо цяжка жыць беднаце на адзіночных гаспадарках. Ад мясцовых арганізацый нават дакладчыка ніяк не дачакаемся.

Паўлова.

Межанскі р-н, Патаменскі с.-с.

КІРАЎНІКА НЯ СТАЛА, РАБОТА ЗАДРАМАЛА.

Як выехаў наш кіраўнік дэльсходу, так ніхто і не клапоціцца больш аб працы.

Сьпіць жанпраца ў м-ку Слаўнае.

Хоць-бы „Белрабсялянка" пабудзіла.

Дайце нам новага кіраўніка просяць дэлегаткі.

М.

КОЛЬКІ ЧАСУ ТРЭБА ЧАКАЦЬ АДКАЗУ.

Скардзяцца актывісткі дэлегаткі Гарадоцкага раёну, што Селішчанская яч. КП(б)Б нічога не адказвае на іх заяву аб прыёме ў партыю іх.

Гарбаценкова і Каралева высказаліся так: „Мы хочам палітычна вучыцца, а нас не запрашаюць на сходы.

В. Ж.

МЫ ПРАЦУЕМ І САЮЗУ НЯ ЧУЕМ.

Дайніцы саўгасу „Чырвоны Молат" у м. Халопенічах, працуюць дзень і ночь. Няма дня адпачынку, ледзь вырвуць гадзіну паабедаць,

Рабочком пад носам, але яго днем з агнём ня ўбачыш.

Дэлегатка.

САЮЗ ХВАРЭЭ, САКРАТАР ДУРЭЭ.

Воспитательная работа не ведется; среди членов союза есть антисемиты и другие больные явления. Собрание бывает раз в 2 месяца и то высказываться, как следует, не дадут. Начинаешь высказываться, а секретарь месткома Шапиро берет за шиворот и говорит: „Закрой свою плевательницу".

Р.

Витебск, союз нарпит.

Зьнішчым шкоднікаў у гародзе.

Гароднія расьліны маюць многа ворагаў. Адна толькі капуста—галоўная гародняя расьліна страчвае штогодна па БССР некалькі дзесяткаў мільёнаў пудоў ураджаю, што нават па нізкім цэнам складае мільёны рублёў. Галоўныя шкоднікі гароду ў БССР наступныя:

Гароднія блошкі.

Гэта маленькія жучкі. Яны зімуюць дарослымі, прасынаюцца ад зімовага сну рана і жывуць на дзікіх расьлінах спачатку, а пасьля пераходзяць на гароднія расьліны. Асабліва пакутуе ад іх турнэпс і капуста. Гароднія блошкі кладуць яйкі на лісьце, з якіх праз некалькі дзён выходзяць маленькія чарвячкі, яны ўпіваюцца ў нутро ліста і робяць ходы. Чарвячок жыве каля 3-х тыдняў, пасьля пераходзіць у зямлю (дзе і ўваходзіць у лялячку). Праз 7—10 дзён з лялячкі выпаўзае жучок.



Бялак-капусьнік.

Як змагацца з „гароднімі блошкамі“.

Неабходна: 1. Зьнішчаць пустазельле ў гародзе, 2. Вылаўліваць блошак клеявымі флажкамі, флажкі намазваюцца клеем, але так, каб ніжні край быў чысты, праводзяць флажком па расьліне, такім чынам, каб намазаная частка не закранула іх. Блошкі скачуць і пападаюць на клей. 3. Пасыпаць расьліны попелам, тутуновым пылам, тамасавым шлакам, гашанай вапнай ці нават пылам з дарогі. 4. Апрыскваць парыскай зеленьню. Парыскай зелені бяруць 8—12 грам на вядро вады, 16—24 гр. нягашанай вапны. Вапну спачатку гасяць невялічкай колькасьцю вады, каб зрабіўся белы парашок, і разбаўляюць вадой, пакуль не атрымаецца жыжка, падобная да малака.

Што гэта за капусная муха.

Яна надта падобна да звычайнай мухі. Зімуе гэта муха, галоўным чынам, у капшучках, больш рэдка—дарослай мухай ці чарвячком. Дарослыя мухі на зімоўку забіваюцца ў шчыліны сьцен у пагрэбох; капшучкі зімуюць у зямлі, ці ў храпках (качарыжках) капусты, а чарвячкі—найчасьцей у храпках. Гэты шкоднік зімуе ў розных стадыях разьвіцьця і таму ўвесну ён паяўляецца ў розныя тэрміны. Найбольш гэтых мух бывае ў час высадкі ў грунт расады. Самкі кладуць яечкі на сьцебялёк капусты каля зямлі, ці запіхаюць іх у шчыліны зямлі каля сьцябла і нават бывае зьверху на глебе, каля расьліны. Яечкі—белага колеру, Ня гледзячы на тое, што яны вельмі маленькія, іх вельмі лёгка скмеціць на зялёным сьцябле і на зямлі. Пад аднэй расадай бывае да 100—200 і нават больш яечак. Праз 6—8 дзён з яечак выходзяць бледна-малочныя чарвячкі, якія адразу дабіраюцца да падземных частак сьцябла і пачынаюць скрабсьці яго паверхню. Жыве чарвячок мухі каля месяца, калі падыходзіць час яму ператварыцца ў лялечку, ён пакідае расьліну і ў зямлі робіць буры капшучок. Стадыя лялечкі працягваецца ня менш 10 дзён.

Неабходна змагацца з беляком.

Робяць гэта так: 1. Кожны тыдзень душаць яечкі і маладых вусеняў, 2. Апырскваюць капусту парыскай зеленьню.

Таксама змагаюцца і з „Капустажорам“,—матылём шэрага коляру, які лётае ўначы. Вусень „Капустажора“ інакш завуць „Нутраны чарвяк“, таму што яна залазіць у нутро качана, псуе і засьмечвае яго, ад чаго качан загнівае.

Капустажора яшчэ вылоўваюць патакай, якую наліваюць у карытца ці цэбрык, дадаюць дражджэй. Матылі ляцяць на патаку і гінуць у ёй.

Чым зьнішчаць капусную муху.

Трэба: 1. Зьнішчаць пустазельле, 2. Увосень і раньняй вясною пераворваць гароднія вучасткі, 3. Адграбаць ад расьлін яйкі, 4. Паліваць капусту карболавай эмульсіяй, якая рыхтуецца так: у гарачай вадзе распускаюць 64—80 гр. зялёнага мыла, увесь час зьбіваючы яго ў пену, паступова дадаюць 400 гр. неачышчанай карболкі, працягваючы зьбіваць у пену, усё гэта ўліваюць у вядро вады. 5. Карэньні расады, заражоныя капуснымі мухамі, прамываць вадою, карболавай эмульсіяй, тутуновым адварам.

Усім вядомы бяляк-капусьнік.

Бяляк даволі вялікі матыль, крыльлі яго белага колеру з зялёным адценкам. У самца маецца па чорнаму кубу на верхніх канцах крыльляў, у самкі, акрамя таго,—па дзьве чорных плямы на пярэдніх крыльлях. Зімуюць лялечкі. Вясною—вылятаюць матылі, спарваюцца і самкі кладуць яйкі кучкамі на лісьце капуснае расады. Праз 6—8 дзён з яек выходзяць чарвячкі (вусені), якія ядуць мякаць ліста зьнізу, застаўляючы верхнюю скурку ліста, робячы як ваконца. Вусені лялькуюцца ў розных мясцох: на хатах, хлявах, плоце і г. д. У нас бывае іх 2 пакаленьні ў год.

Як зрабіць парыскую зелень.

Парыская зелень асобна разьмешваецца з вадой і потым уліваецца ў вапеннае малако. Апырскваньне джыпсікам: яго бяруць 10—20 грам на 12 літраў (1 вядро) вады. Апыльваньне парыскай зеленьню ці джыпсікам. Парыскай зелені, ці джыпсіку бяруць 1 частку на 10 частак попелу, тутунага пылу, гашанай вапны. Добра перамешваюць і апыльваюць пры дапамозе асобнага апарата-апыліцеля ці праз сіта.

Старонка практычнай працы дэлегатак.

(Гутарка аб сацыялістычным спаборніцтве).

— Хадзем, Ганна, на сход!

— І ўлетку трэба-ж хадзіць?—Ну, вядома.

— Гаварыў-жа наш кіраўнік т. Васільлеў, што на лета ня спыняецца праца дэлегацкіх сходаў.

Надвор'е прыемнае. Зьбіраліся маруднавата. Пакуль сядзелі каля хаты-чытальні на ганку і гаманілі аб усім патроху.

Гуртаваліся больш навакол Настулі—камуністкі, прыехаўшай на адпачынак з гораду дамоў.

— У нас на фабрыцы,—апавядала Настуля,—зараз вывучаем пастановы XII зьезду КПБ і XVI Усесаюзнай партканфэрэнцыі. Пяцігадовы плян разьвіцьця народнае гаспадаркі прапрацавалі.

— Вось цікава, па пляну яскрава бачна, як будзе расьці наша прамысловасьць і сельская гаспадарка. Якая паміж імі шчыльная сувязь.

Для ажыцьцяўленьня пастаноў партыі і ўраду мы зараз у сацыялістычнае спаборніцтва ўступілі.

— Як-жа гэта ў спаборніцтва?—запыталася Марфуша.

— А вось як: мы паставілі мэтай зьнізіць сабекошт нашае вытворчасьці, палепшыць якасьць, даць працоўнаму насельніцтву—больш танныя і дабраякасныя тавары.

Напрыклад, у нас на ф-цы ў мантальным цаху некаторыя работніцы нядбайна адносіліся да пражы.

Мы зараз парашылі строга сачыць, каб ня прападала дарма ніводная нітачка. У час работы спыніць усякія гутаркі, размовы. Не прагульваць ніводнага дню. Мы зрабілі ўмову на сацыялістычнае спаборніцтва з другімі прадпрыемствамі:—з акулярнай фабрыкай, з Дзьвіной, працкаляктывам панчошнікаў. Мы ўзялі на сябе абавязак на бліжэйшы час зьнізіць сабекошт на 7,5%, гэта значыць на кожны рубель—7½ к.

— І на вёсцы зараз праводзім сацыялістычнае спаборніцтва,—казала жанарганізатар, т. Максімава.

Каб хутчэй каляктывізаваць сельскую гаспадарку, хутчэй павысіць ураджайнасьць, зьнішчыць трохполку, асушыць балоты, каапэраваць батракоў, беднату, сераднякоў, хутчэй выцясьніць кулака.

Нам трэба ведаць, што сацыялістычнае спаборніцтва гэта не часовая кампанія, а штодзенная праца па перабудове нашай вёскі на сацыялістычны лад.

— „Спаборніцтва павінна быць разгорнута па лініі саўгасаў, калгасаў, камітэтаў узаемадапамогі, спажыўкаапэрацыі, загатоўчых дзяржустаноў, дасьледчых станцый, комсамолу, палітасьветустаноў, устаноў аховы здароўя, дэлегацкіх сходаў і іншых грамадзкіх арганізацый".

— Гэта дырэктыва партыі.

Кожная з дэлегатак павінна абдумаць, што мы можам зрабіць.

— Зрабіць можна і трэба шмат.

Дэлегаткі прымацованы для практычнай працы да розных устаноў. Яны павінны быць прыкладам у выкананьні сваіх абавязкаў, высунуць шэраг пытаньняў па паляпшэньню працы, па змаганьню з бюракратызмам.

Слухайце, сялянкі!

Вёска Мала-Стахаўка, Барысаўскага раёну, арганізавала малочную арцель, асушыла 10 гэктараў балота, будуе новую школу, капае торп на ўгнаеньне, бярэцца ачысьціць межы ад пустазельля.

Мала - Стахаўка выклікае ўступіць у сацыялістычнае спаборніцтва вёску Студзенку і Быччу.

Сялянкі Студзенкі і Быччы, чым вы адказваеце на выклік Мала-Стахаўкі? Што робіце вы для таго, каб выканаць мерапрыемствы, намечаныя партыяй і ўрадам у галіне перабудовы сельскай гаспадаркі?

Сялянкі Мала-Стахаўкі, праз „Белрабсялянку" падзяліцеся вопытам вашых дасягненьняў.

Яны павінны быць першымі ў арганізацыі калгасаў, каапэраваньня, арганізацыі малочных арцеляй, птушкаводных т-ваў і г.д.

Дэлегацкі сход аднае вёскі можа і павінен выклікаць на спаборніцтва дэлегатак другой вёскі: на спаборніцтва па арганізацыі дзіцячых устаноў, ачыстцы меж ад сарнякоў; пашырэньня пасеўнай плошчы; палепшыць утрыманьне жывёлы; набыцьця аграведаў; арганізаваць аграгурткі; ня менш чым на два двары выпісваць адну часопісь „Белрабсялянка".

Для канчатковай пабудовы сацыялізму, нам патрэбна быць пісьменнымі. Арганізуем сацыялістычнае спаборніцтва і на тое, які дэлегацкі сход цалком ліквідуе сваю няпісьменнасьць.

— Гэта нам трэба памятаць,—перабіла Максімаву дэлегатка—камсамолка Грыцук.

— Вось Мала-Стахаўцы выклікалі на сацыялістычнае спаборніцтва вёскі Студзёнка і Быча.

Мала-Стахаўцы арганізавалі ў сябе малочную арцель, асушылі 10 гэктараў балота, будуюць школу, капаюць торп на ўгнаеньне і г. д.

Мы павінны браць прыклад.

Няхай кожная дэлегатка і ўсе разам абгавораць у сябе гэтае пытаньне, няхай кожная падумае, што яна можа і павінна зараз-жа зрабіць.

Б. Дварэцкая.

Сялькоркі! Пішэце, як рыхтуецца вёска да збору ўраджаю. Што робіцца для арганізацыі дапамогі беднаце ў час збору ўраджаю.

Сялькоркі павінны быць застрэльшчыкамі ў справе арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва на вёсцы. Пішэце нам аб сацыялістычным спаборніцтве ў сельскай гаспадарцы.

скорая помощь на дому



Чым дапамагчы ўкушанаму гадзюкай.

Укус зьмяі амаль заўсёды зьяўляецца небясьпечным для чалавека, бо ў кроў пападае зьмяіны яд. Вось чаму пры ўкусе зьмяі неабходна сваячасовая правільная дапамога.

На месцы укусу бываюць ў некаторых выпадках толькі 2 кропкавыя болькі, а інады паяўляецца пухліна, месца укусу чырванее. Пасьля паяўляецца ацёк. Могуць таксама ўтварыцца пухіры. Ва ўкушанага пачынаецца галавакружэньне, дрыжаньне, рвота, панос, абмарока і калі не дапагчы хвораму, ён можа хутка памерці.

Першая дапамога пры ўкусе зьмяёй такая: трэба перавязаць ўкушанае месца (нагу, руку) вышэй раны рушніком, вяроўчынай, папругаю. Ня спыняць крывасток, а, надворот трэба, найбольш выціснуць крыві з раны. Інават, калі ў роце, на губах няма болек ці драпін, трэба зараз-жа высмактаць яд з раны. Можна прыпякчы параненае месца расьпечаным железам, ці дакрануцца да ранкі запалкаю, абмочанаю ў моцным азотным ці саляным квасе. Пасьля прыпяканьня трэба зьняць перавязку, карысна таксама прамыць рану нашатырным сьпірытусам.

Дапамога пры параненьні бешанай жывёлінай.

Калі параніць чалавека бешаная жывёліна (сабака, воўк), трэба абмыць рану і як мага хутчэй хворага накіраваць ў пастэраўскую станцыю. Толькі ў гэтым адзіны ратунак.

Такія станцыі маюцца ў Менску, Віцебску, Гомелі, Магілеве і іншых.

Калі ўжаліць пчала.

Трэба выцягнуць жала з цела, паліць на ранку 1—2 кроплі нашатыру і пасьля прыкладаць халодныя прымочкі. Для гэтага ў пасудзіну з халоднай вадою кладуць дзьве чысьценькія анучкі, адну выціскаюць і прыкладаюць да месца ўкусу, праз некалькі хвілін, калі кампрэс пасьпеў сагрецца, яго зьнімаюць і замяняюць другім, вынятым з вады, а першы зноў кладуць у ваду.

Как оказать помощь утопающему.

При спасании тонущего необходимо иметь в виду следующее:

Ободрять тонущего криками, что его спасают и что ему следует двигаться руками и ногами, стараясь удержаться на поверхности 1—2 минуты. Бросать веревку в воду, вожжи, длинные пояса, доски, лестницы, кричать тонущему, чтобы он ухватился за эти предметы. Бросающийся на помощь должен раздеться; если же время не позволяет, то он должен хотя бы снять сапоги, верхнее платье вывернуть карманы и развязать внизу кальсоны.

Тонущие обычно хватаются за руки, за шею спасающего и, таким образом, мешают ему плыть. Вот почему спасающий должен подплыть к тонущему сзади, схватить его за волосы или голову положить его лицом вверх к себе на грудь, причем сам он ложится на спину, оставаясь в таком положении, пока подоспеет помощь, или же плывет на спине.

Следует всегда бросаться в воду выше того места, где предполагается утопленник. То место, где находится утонувший, узнается по пузырькам воздуха, которые время от времени появляются на поверхности. Нужно помнить одно чрезвычайно важное правило—*действовать быстро и решительно*.

Как только утонувший извлечен из воды, необходимо поскорее снять одежду или лучше разрезать ее. Извлеченному из воды нужно очистить рот, глотку, ноздри от попавшей в них пены, грязи, песку, ила и т. д. Повернуть утопленника лицом вниз на бок, подставить под живот колено, или положить его на сложенную валиком одежду, или на поленое, обернутое в одежду и надавливать на спину, чтобы вылилась вода изо-рта, глотки и верхних дыхательных путей. Нажав раза 3—4 на спину, немедленно положить пострадавшего на спину и приступить к искусственному дыханию. Цель искусственного дыхания—вызвать у пострадавшего нормальное дыхание, ввести в кровь кислород, что достигается постепенным растягиванием и сдавливанием грудной клетки.

Берут руки пострадавшего ниже локтей и с силой оттягивают их от боковых сторон груди за голову так, чтобы локти касались земли. Удерживают локти в этом положении несколько секунд, затем производят обратное движение и плотно прижимают руки к бокам нижней части грудной клетки и к животу. Искусственное дыхание нужно производить настойчиво, не спеша и продолжать его довольно долго. Известны случаи, когда спасли человека после 1-2 часов применения искусственного дыхания. Во всяком случае, если имеется хоть маленькая надежда на спасение—прекращать искусственное дыхание не следует.

При искусственном дыхании нужно растирать верхние и нижние конечности суконной тряпкой, мягкой щеткой, давать нюхать нашатырный спирт, согревать тело горячими бутылками, всякой одеждой. Если появляются признаки дыхания, то не следует прекращать оживляющих мер до тех пор, пока обмерший не будет правильно дышать, затем его нужно перенести в постель, давать теплое питье, возбуждающие капли, закрыть теплым одеялом. Желательно, чтобы больного осмотрел врач и дал свои указания на дальнейшее время.

Д-р Нейфах.

КАРЫСНЫЯ ПАРАДЫ.

Уничтожайте мух.

Чтобы уничтожить мух, прежде всего надо мешать им плодиться. Для этого нужно удалить от жилья всякую падаль, навоз и отбросы, в которых выводятся мухи. Не следует так-же допускать, чтобы сами жители повсюду по двору и вокруг дома—разбрасывали свои испражнения. Человеческия испражнения нужно каждый раз засыпать землей вершка на 2—3, а где есть—торфом. Отхожее место нужно устроить так, чтобы стенки были плотно сбиты или замазаны, а сиденье закрывалось. Тогда мухи не смогут пробраться туда для кладки яичек.

Пищу, посуду, полотенца для посуды нужно хранить в закрывающихся ящиках или шкафчиках. Иначе мухи будуць заживать все это и приносить заразу. С'естные припасы в лавках, чайных, столовых, следует держать или под стеклом или под сетками.

В жилищах нужно уничтожать мух хлопушками, мухаловками липкими бумажками. Липкие бумажки легко сделать, смазав плотную бумагу густой патокой

На зиму мухи засыпают, приютившись где нибудь в сухих углах и щелях и просыпаются, когда наступает тепло. Зимой следует поэтому осмотреть все теплые помещения, где могут зимовать мухи. Найденых спящих мух сметают веником и сжигают в печке. Чем больше мух будет убито зимой, тем меньше окажется их потом летом.

Понятно, что борьбу с мухами следует вести сообща, всей деревней; надо уничтожать их во всех дворах, иначе мух не извести.

Кроме домашней мухи, не кусающей людей, к осени в жилища залетают жалящие мухи—жигальи. Эта муха своим острым хоботком прокалывает кожу людей и животных и пьет их кровь. При этом она может заносить прямо в кровь человека микробов некоторых болезней, например, сибирской язвы и рожи. Уничтожать жигалок нужно теми же способами, что и домашних мух.

Слепни.

Слепни, кусая животных и людей, могут заражать их сибирской язвой и другими болезнями. В жаркие дни слепни часто, пролетая над водой—на лету пьют из нее воду. Этим мы можем пользоваться, чтобы их иничтожать. Для этого лужи где пасется скот, заливают небольшим количеством керосина или нефти.

Когда слепень пьет из такой лужи воду, керосин или нефть закупоривают у него дыхательные трубочки, и слепень задыхается и тонет в воде. Иногда для борьбы со слепнями устраивают такие ловушки нарочно: выкапывают яму для воды или ставят на пастбище колоду с водой и поливают эту воду нефтью или керосином.

Зьнішчым камароў.

З камарамі трэба змагацца зімою і ўлетку. Узімку адшукваюць іх зімоўку ў паграбах і розных шчылінах. Ацупянелых камароў зьмятаюць з сьцен і столі, зьбіраюць і паляць у печы. Калі-ж камары лятаюць, то ў пограбе трэба запаліць табаку ці махорку, паклаўшы яе на кавалак бляхи. Тутуновы дым глушыць камароў, яны падаюць з сьцен і столі, пасьля чаго іх трэба пазьметаць і спаліць.

Калі больш камароў спаліць зімою, то іх менш наплодзіцца ўлетку

Каб перашкодзіць камарам пладзіцца, трэба асушыць такія месцы, дзе скапляецца і састойваецца вада. Дробныя лужы і балотца трэба засыпаць зямлёю ці зрабіць вадасток. Трэба сачыць за тым, каб вада не застойвалася ў розных чарапках, бітых пляшках, бляшанках. Бочкі, у якіх вада захоўваецца на выпадак пажару, трэба накрываць шчыльнымі крышкамі, каб камары не маглі ў такія бочкі адкладаць свае яйкі.

У стаячых няглыбокіх стаўках, канавах, якія служаць для вадапою жывёлы і іншых гаспадарчых патрэб належыць разводзіць рыбу, якая зьнішчае заплодні камароў. Карысна таксама заводзіць хатнюю вадзяную птушку, якая таксама дапамагае змагацца з камарынымі заплоднямі.

Калі бліжняе балотца чаму небудзь засыпаць нельга, трэба яго праз кожныя 10 дзён заліваць нафтаю ці газаю па чвэрці хунта на кожную сажэнь, ад гэтага камары таксама гінуць.

У малярыйных мясцох карысна на лета завешваць вокны марляю, праз якую камар не пралазіць у хату. Калі-ж у хату наляціць многа камароў трэба рашчыніць вокны і дзьверы і сярод хаты на якой небудзь бляшанцы запаліць гліцу ад сьвежай хвоі. Дым такі прымусіць камароў выляцець. Карысны дапаможнік чалавеку ў барацьбе з камарамі гэта лятучая мыш якую трэба аберагаць.

▲▲▲▲▲▲▲▲▲ ▲▲▲▲▲▲▲▲▲

АДКАЗЫ НА ЗАПЫТАНЬНІ.

Г-ке Зенькевич Наталии Андреевне.

(С-х. т-во „Набат" Озериц. С/с. Толочинского р-на Оршан. Округа).

Напишите заявление прокурору Минокруга (Советская д. № 68) с просьбой об отмене решения по Вашему делу и пересмотру его.

Ваше заявление о взяточничестве судьи не должно быть голословным, а надо указать факты.

Укажите новые обстоятельства по Вашему делу, напр. свидетели, письма и т. п.

Укажите в заявлении, где находится ваше дело, в каком Нарсуде.

А. Ф. Калашниковой—Быхов.

На В/запрос—кому должны абортные комиссии разрешить аборт—есть инструкция, разосланная еще в 1924 г. Наркомздравом Белоруссии.

При разрешении аборта надо учесть: 1) Аборт можно делать только тогда если беременность до 2-х месяцев, посьле 2-х месяцев аборт опасен для жизни женщины, и в таких случаях нужно давать письменную справку, что отказано в аборте в виду беременности двух месяцев. 2) При разрешении аборта нужно учесть материальное положение, жилищные условия есть-ли уже дети и т. д. Но основное, надо считаться с тем, что если женщина-работница, батрачка, беднячка, середнячка все же решила сделать аборт, несмотря на убеждения—тогда лучше разрешить ей сделать это в больнице, дабы она не ходила к бабке.

Инспектор Охматмлада.

Федеринчик Нине Антоновне.

Сообщите по какой причине не взыскиваются присужденные Вам судом алименты, либо по тому что судебный исполнитель халатно относится к взысканию или потому, что сам ответчик укрывается от платежа.

В первом случае Вам следует обжаловать действия судебного исполнителя в Нарсуд (по листу, прикрепления суд. исполнителя).

Во втором нужно возбудить уголовное дело по обвинению вашего бывшего мужа по ст. 232 (злостный неплательщик алиментов).

Возможно, что исполнительный лист находится в милиции, тогда обжаловать можно т. Кролю.

Г. Минск, Штаб милиции, или РКИС Бюро жалоб, Советская д. № 55.

Юрисконсульт Охрматмлада *Лившиц.*

29.VI.
616





УВАГА!

З гэтым нумарам усе падпішчыкі атрымаюць выкройку.

Малюнак выкройкі быў надрукаваны ў папярэднім № 11 „Белрабсялянкі“.

ЛЁТАРЭЙНЫЯ БІЛЕТЫ

больш друкавацца ня будуць.

Сьпяшайцеся прыслаць іх у рэдакцыю, бо 5 жнівеня будзе розыгрыш.

Выражце гэты білет, напішэце на ім сваё прозьвішча, імя, адрас і тэрмін падпіскі

І РАЗАМ З КВІТКОМ НА ЗДАЧУ ПАДПІСКІ

перашліце ў рэдакцыю часопісі

„БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА І СЯЛЯНКА“

Менск, Савецкая 45.

Лётарэйныя білеты пачалі друкаваць ў нашай часопісі з сакавіка месяца, але права на ўдзел у лётарэі маюць толькі тыя, хто падпісаўся на „БЕЛРАБСЯЛЯНКУ“ ў час з 1-га студзеня да 1-га мая, ня менш як на 3 месяцы.

3-х месячныя падпішчыкі перасылаюць у рэдакцыю (разам з квітком на здачу падпіскі) . . **1 білет.**

Паўгадовыя . . . . . 2 білеты.

Падпішчыкі на 9 месяцаў . . . 3 білеты.

Падпішчыкі на год . . . . . 4 білеты.

Каляктыўныя падпішчыкі прысылаюць адразу ўсе білеты з агульным квітком на здачу падпіскі.

Перасылка лётарэйных білетаў павінна быць аплачана маркамі, даплатныя—выкупляцца ня будуць.

Лётарэйны білет №

НА ПРАВА ЎДЗЕЛУ Ў ВЯЛІКАЙ ЛЁТАРЭІ ЧАСОПІСІ „БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА І СЯЛЯНКА“.

Прозьвішча і імя .....

Паштовае аддзяленьне .....

Акруга .....

Раён .....

Вёска .....

Тэрмін падпіскі .....

Выдавец—**Аддзел работніц і сялянак ЦК КП(б)Б.** *Рэдактары* **С. Крэмер. М. Меерзон.**

Менск, друкарня БДВ. Заказ № 3001. У ліку 12.600 экз. Галоўлітбел № 1906.

##3н//193927 (050)

1964 г.

2

B0000000226 1578